УДК 821.161.3.09

***Вячаслаў Іванавіч Караткевіч***
*нач. упраўлення маніторынгу якасці адукацыі,*
*навуковы супрацоўнік лаб. гуманітарнай адукацыі*
*Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*
***Viachaslau Karatkevich***
*Head of Department for Monitoring the Quality of Education,*
*Researcher of the Laboratory of Humanitarian Education*
*of National Institute of Education Ministry of Education Republic Belarus*
e-mail: viaczkar@gmail.com

# МОНСТР ЯК УВАСАБЛЕННЕ «ІНАКШАСЦІ» (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ КАНЦА XX ст.)

*Разглядаецца спецыфіка ўвасаблення вобраза монстра як феномена сучаснай культуры на прыкладзе беларускай драматургіі канца XX ст. Асаблівая ўвага надаецца творам Міколы Арахоўскага, Ігара Сідарука, Юрыя Станкевіча. У п'есах гэтых пісьменнікаў вобразы ў той або іншай ступені маюць монстрападобны характар, які ствараецца рознымі спосабамі. Монстры ў творы набываюць рознае семантычнае гучанне, але іх аб'ядноўвае ўсведамленне ўласнай «інакшасці» і амбівалентнасці – «агрэсар» і «ахвяра»). У рэцэпцыйнай жа свядомасці монстры атаясамліваюцца з псіхалагічнымі праблемамі грамадскай свядомасці, паколькі з'яўляюцца прадуктам несвядомай праекцыі палітыкі мультыкультуралізму ў сучасным соцыуме. Мэта даследавання – аналіз монстрападобных вобразаў праз прызму «інакшасці»; прадмет даследавання – спосабы рэпрэзентацыі вобраза монстра і сэнсавае напаўненне аўтарскага пасылу рэцыпіенту.*

**Ключавыя словы:** *вобраз, монстр, беларуская драматургія, семантыка вобраза, свой, чужы, амбівалентнасць.*

# Monster as an Embodiment of «Otherness» (as an Example of Belarusian Drama of the End of the 20th Century)

*The article deals with the specifics of the embodiment of the monster image as a phenomenon of modern culture on the example of Belarusian drama of the end of the 20th century. Particular attention is given to the works of Mikola Arakhousky, Ihar Sidaruk and Yury Stankevich. The characters in the works of these writers have more or less monstrous image that is generated in various ways. Monsters in the work acquire different semantic sound, but they are united by the awareness of its «otherness» and ambivalence («the aggressor» and «the victim»). In receptive awareness, the monsters are identified with the psychological problems of social awareness, because they are the product of the unconscious projection of the policy of multiculturalism in modern society. The purpose of research is the analysis of the monstrous images through the prism of «otherness»; the subject of the research is the means of representing the image of the monster and the semantic content of the author's message to the recipient.*

**Key words:** *image, monster, Belarusian playwright, the semantics of the image, one's own, strange, ambivalent.*

## Уводзіны

Са старажытных часоў праявы «інакшасці» дэманізаваліся і ўвасабляліся ў фантастычных вобразах монстраў, якія на працягу развіцця чалавецтва праз уяўленне і фантазію набывалі рознае семантычнае напаўненне. Такога роду істоты заўсёды супрацьпастаўляліся чалавеку, атаясамліваліся з варожым і страшным, што абавязкова павінна быць пераможана.

Монстр выкарыстоўваўся ў літаратуры і іншых відах мастацтва са старажытных часоў. У міфалогіі, вуснай народнай творчасці з'яўленне монстрападобных персанажаў і барацьба з імі часцей звязваецца з пераходным перыядам развіцця грамадства: ад матрыярхату да патрыярхату, набыццём новай сістэмы маральных і этычных каштоўнасцяў, а таксама трансфармацыяй унутранага свету героя. Асаблівую папулярнасць гэты вобраз набыў у культуры XIX ст., калі актуалізавалася пытанне адказнасці чалавека за свае ўчынкі («Віктар Франкенштэйн» Мэры Шэлі, «Востраў доктара Маро» Герберта Уэлса і інш.). У гэты час першабытны страх перад монстрамі замяняец-

ца шкадаваннем і адчуваннем уласнай віны, бо «інакшыя» персанажы ў адпаведнасці з рамантычнымі ўстаноўкамі становяцца дуальнымі.

Новы перыяд папулярнасці монстрападобных вобразаў – канец XX ст. Гэта час пераасэнсавання прыроды «інакшага», калі монстр губляе некаторыя свае атрыбуцыі, але захоўвае адчужанасць у адносінах да «нармальнага» свету. Амбівалентны сучасны свет (усход – захад, свой – чужы, я – іншы, сябар – вораг, мы – яны і інш.) «прапаноўвае» мастацкай літаратуры палярныя ў быційных і эстэтычных адносінах зыходныя для пабудовы яе вобразнай прасторы і, адпаведна, напаўнення яе неадназначнай, а то і супярэчлівай семантыкай.

Славой Жыжак разглядаў монстра ў свеце як звяно, што злучае, яднае сучасную культуру і прыроду [1, с. 136]. Такія вобразы ўзбагачаюць, ускладняюць (а часам і спрашчаюць) карціну свету. Многія культуролагі і літаратуразнаўцы разглядалі монстраў як спосаб увасаблення «інакшасці» ў мастацкай літаратуры [2–4]. У даследаваннях, дзе аналізуюцца вербальныя, экранныя і іншыя тэксты, што рэпрэзентуюць монстраў як «інакшасць», прапануюцца зыходныя для магчымых інтэрпрэтацый гэтых вобразаў. Беларускаму літаратуразнаўству бракуе такога тыпу даследаванняў, тым больш калі гутарка ідзе пра характарыстыку вобразнай сістэмы драматургіі. Пры гэтым варта адзначыць, што ў некаторых артыкулах [5–10] разглядаецца спецыфіка адлюстравання фантастычных вобразаў у драматургічных тэкстах асобных аўтараў (Юры Станкевіч, Ігар Сідарук, Мікола Арахоўскі, Галіна Багданава і інш.).

**Метадалогія і метады даследавання**

Для дасягнення мэты нашага даследавання выкарыстоўваўся герменеўтычны метад і, адпаведна, прыёмы аналізу і сінтэзу.

З канца XX ст. і да нашага часу ў межах маскультуры назіраецца беспрэцэдэнтная папулярнасць пачвараў, у некаторых творах звычайным людзям адводзіцца толькі маргінальная роля (прыгадаем, напрыклад, папулярныя фільмы Роберта Земекіса: «Хто падставіў труса Роджэра» (1988), Бары Зоненфельда «Сямейка Адамс» (1991), «Сямейныя каштоўнасці Адамсаў» (1993), мультыплікацыйныя фільмы Дэна Скэнлана «Тачкі» (2006), «Універсітэт монстраў» (2013) і інш.). Фактычна мы назіраем, як у эпоху татальнай талерантнасці і мультыкультурнасці выбудоўваюцца трансгрэсіўныя пляцоўкі, на якіх гарманічна пачуваюць сябе рознавектарныя культуры, дзе монстр становіцца паўнапраўным суб’ектам камунікацыі.

Такія вобразы маюць розную прыроду ў мастацкіх творах. Кацярына Шапінская вылучае наступныя асноўныя крыніцы і механізмы стварэння монстраў:

1) хімерызацыя – стварэнне вобраза праз камбінацыю розных рэальных істот і накладванне на такую пачвару дадатковай семантычнай нагрузкі;

2) гарганізацыя – ператварэнне станоўчага ці нейтральнага героя або нават боства ў пачварную монстрападобную істоту;

3) кібаргізацыя – стварэнне монстра ў выніку навуковых эксперыментаў або новых тэхналогій [4, с. 183–184].

Асобым механізмам пры гэтым з’яўляецца гібрыдызацыя – спалучэнне некалькіх спосабаў стварэння вобраза монстра.

У беларускай драматургіі канца XX ст. прадстаўлены монстры, сканструяваныя рознымі спосабамі.

Вядома, што хімера спераду была львом з тулавам казы і хвастом змяі, але мела неўласцівыя для ўсіх трох жывёл якасці: паліла агнём з пашчы і была бессмяротнай. Падобныя вобразы сустракаем у драме Міколы Арахоўскага «Лабірынт» (1997). Асноўнае дзеянне ў творы разгортваецца ў кватэры мастака Стаха, што ўяўляе сабой лабірынт. Тут з’яўляюцца жывыя карціны – увасабленні хворых фантазіі і жаданняў: Муза, Кабылка, Фалас і іншыя Істоты. З апісанняў некаторых Істот зразумела, што яны нясуць на сабе адбіткі патаемных мрояў: Муза – «стварэнне ў белым, узнёслае і натхнёнае» [11, с. 31], Кабылка – «конепадобнае стварэнне, якое нечым нагадвае і “Музу”, і Жанну» (адну з галоўных дзеючых асоб п’есы) [11, с. 31]. Гэта монстры, якія хоць і народжаны самім героем, але паступова авалодваюць ім, і Стах губляе кантроль над сітуацыяй: «[СТАХ] Мае жывыя карціны?!. Я не ведаю, як яны ўзніклі, але яны ўзніклі і займелі нада мною ўладу. Яны мяне адлучылі ад маіх сапраўдных карцін, ад алоўка, ад фарбаў, ад палатна, пакутлівай радасці творчасці. Я ўжо не твару – імітую

творчасць, даўно не жыву – імітую жыццё. Прагані іх» [11, с. 58].

Звернем увагу, што сам аўтар у сваіх рэмарках імкнецца супрацьпаставіць чалавека і монстраў: «Істоты і анёл, за выключэннем некалькіх выпадкаў, аб якіх у рэмарках, для персанажаў-людзей нябачныя.

Істоты павінны паказвацца часцей, чым гэта зазначана ў тэксце. Будзем тут спадзявацца на фантазію і пачуццё меры творцаў спектакля» [11, с. 31].

Монстры ў «Лабірынце» – гэта ўвасабленне імітацыі творчага пошуку ў напаўзаўважных, але надакучлівых вобразах. Падмена сапраўднага сімулятыўным, штучным, разбурэнне традыцыйнай сістэмы эстэтычных каштоўнасцяў і замена яе філасофіяй геданізму і верай у танны поспех – прыкмета постмадэрну, у якім жыве наша грамадства. Праз гэта адбываецца вяртанне да лабірынту – хаатычнага стану. Рэцыпіенту навязваецца сутыкненне з хворымі фантазіямі, што характэрна для беларускага постмадэрнізму ў яго шызалітаратурнай мадэлі [6, с. 15–17]).

Монстры ў п'есе Ігара Сідарука «Крык» (1995) таксама пабудаваны праз хімерызацыю. Мастацкая прастора твора – гэта палілогі трох персанажаў зааморфнага і антрапаморфнага характару, два з якіх хаваюцца за маскамі: «Дрын, ён жа Дроб, ён жа Дрот. Абзеля, яна ж Ляскатунка, яна ж Гарбуха» [12, с. 39]. Унутраныя праблемы названых вышэй мужчыны і жанчыны выяўляюцца праз знешні выгляд (горб у жанчыны) ці вербальным шляхам (метафарычны аповед мужчыны пра паездку ў цягніку і захапленне жанчынамі, якія там ехалі; тут назіраем увасабленне пошукаў сапраўднага шчасця і бессэнсоўна страчанага жыцця). Мужчына і жанчына ў дадзенай п'есе, як і Шкрыбудаб, маюць умоўны характар.

Дрын і Абзеля – амбівалентныя монстры, якія спалучаюць у сабе агрэсію і шкадаванне. У гэтых вобразах знаходзім адзнакі эматыўнасці, бо яны не трацяць адчуванне еднасці з прыродай, здольныя да мяккасці. Пры гэтым эматыўнасць перакрыжоўваецца з дыстымічнасцю. Свядомасць Дрына і Абзелі запоўнена страшнымі ўспамінамі (у т. л. пра смерць дзяцей), гэты эмацыйны стан нагадвае субдэпрэсію. Для гэтых дзеючых асоб выйсце з зачараванага кола жыццёвых непрыемнасцяў – змена знешняга аблічча, але не ўнутраныя перамены:

– Тады я зірнуў насупраць і здрыгануўся ад жаху: маёй Абзелі, маёй мілай чароўнай Абзелі болей не было! Побач сядзела нейкая Ляскатунка…

– Гэта была я.

– Ты?!

– Я. Я была з табою побач заўсёды.

– Мы абсалютна чужыя людзі! Як мы можам быць разам?

– Таму й разам, што чужыя [12, с. 45–46].

Штосьці змяняць яны не могуць праз сваю «інакшасць», бо разумеюць, што пасіўна назіраць, прыстасоўвацца, а не змагацца – гэта спосаб выжывання ў сучасным свеце.

Зусім іншым выглядае трэці монстр – Шкрыбудаб, які мае адзнакі цыклатымічнай асобы. Жорсткасць у адносінах да ўсіх і абыякавасць спалучаюцца ў дадзеным выпадку з эйфарыяй і непераадольным жаданнем дзейнічаць: «загаварыць» суразмоўцу, адцягнуць увагу, адвесці ўбок ад праблем, якія хвалююць Абзелю. У свядомасці Шкрыбудаба фіксуецца ўстаноўка, што знешняя монстрападобнасць (ён мае дзве левыя нагі) дае яму перавагу над іншымі і магчымасць навязваць іншым вырашэнне толькі яго праблемы, праяўляць эгаістычнасць, прысвойваць права распараджацца лёсам іншых асоб.

Калі працэс хімерызацыі заснаваны на эклектычнасці, то гарганізацыя ўяўляе сабой трансфармацыю. У познім міфе пра гаргон, выкладзеным у «Метамарфозах» Авідзія, сцвярджаецца, што Медуза – найбольш вядомая з трох сясцёр – была раней прыгажуняй, самым прыгожым у яе абліччы былі валасы, якія вабілі шматлікіх жаніхоў. Але пасля згвалтавання яе Пасейдонам у храме Мінервы багіня ператварыла валасы гаргоны ў гідр. З таго часу Медуза, каб грэх не застаўся без пакарання, пужае сваім выглядам і носіць на грудзях змей [13, кн. IV, вершы 791–804]. Такім чынам адбылася трансфармацыя станоўчага ў адмоўнае.

Такая мадэль канструявання вобраза выкарыстоўваецца ў драме М. Арахоўскага «Ку-ку» (1992). Вобразная сістэма гэтага твора будуецца на разбурэнні, дэфармацыі першаснага вобраза рэальнасці ў свядомасці Вадзіма. У яго ўяўленнях узнікаюць

монстры-двайнікі –Супермен і Падушкападобны. Іх антрапаморфнасць дае падставы сцвярджаць, што гэта alter ego галоўнага героя, праявы расшчаплення цэласнага Я. Непарыўная сувязь монстраў з Вадзімам падкрэсліваецца іх узаемазамяняльнасцю ([Падушкападобны] (па тэлефоне). Алё. [Ларыса] (па тэлефоне). Вадзік, ты? <…> [Падушкападобны] (аглядваючыся на Вадзіма). Я [14, с. 258]) або знешнім падабенствам («Супермен нечым падобны на Вадзіма, але значна вышэйшы за яго ростам» [14, с. 269]). Праз монстрападобныя вобразы праяўляецца страшная ўнутраная сутнасць рэальнай асобы – Вадзіма.

Падушкападобны выступае ў творы як Аніма ў сістэме архетыпаў К.-Г. Юнга: тут назіраем праяву псіхалагічнага фемiннага ў мужчынскай асобе Вадзіма. У яго несвядомым назіраецца відавочнае дамінаванне Анімы – ірацыянальнае пачуццё, што праяўляецца ў недаверы да ўсяго свету, няўпэўненасці, нерашучасці, а таксама ў інфантыльнасці і раздражнёнасці. Другім важным складнікам эга Вадзіма з'яўляецца яго цень – Супермен, які ўяўляе сабой праяву жорсткасці і цынізму галоўнага героя. Вадзімава эга-свядомасць імкнецца пераадолець адмоўнасць ценевага архетыпу:

[Алена]. Туман усюды, Вадзім. Распоўзся па вуліцах, запоўніў дамы… Ад яго нідзе не схавацца. Вы не адсюль, вы ад сябе хочаце з'ехаць. Толькі, па-мойму, гэта немагчыма.

[Вадзім]. З вамі я змог бы. Адкінуць нікчэмнае, подлае, паскуднае, нібы не са мною гэта было, а з некім іншым. Так, меавіта з іншым, а забываць не трэба, не [14, с. 275].

Адчуванне адмоўнага характару свайго ценю дае магчымасць Вадзіму прымірыцца з самім сабой і адчуць уласную цэласнасць.

Астатнія монстры гэтай п'есы: Клеапатра, Камандзір і іншыя істоты (бязмоўныя) – таксама падкрэсліваюць сапсаванасць і амбівалентнасць асобы: «З'явілася Клеапатра: дыядэма ў выглядзе кобры, набедраная павязка і цела ў ніцях жэмчугу, велічны поступ і цыгарэта ў роце» [14, с. 283].

У фінале твора монстры знікаюць: яны пераможаныя, што можа сведчыць пра дасягненне асобай Вадзіма псіхалагічнай і духоўнай раўнавагі ў працэсе развіцця і асэнсавання сваіх моцных і слабых бакоў. Асоба толькі тады ўяўляецца такой, калі ўсведамляе абодва свае псіхічныя пачаткі (эга і несвядомае). У сваю, чаргу гэтае ўсведамленне дае магчымасць асобе адчуць уласную аўтэнтычнасць і «сапраўднасць жыцця».

Самая малапрадстаўленая ў беларускай драматургіі канца ХХ ст. – група монстраў-кібаргаў. Гэта біялагічныя арганізмы, якія ўтрымліваюць у сабе механічныя ці электронныя прыстасаванні. Такі тып монстраў становіцца надзвычай папулярным у сучасным свеце.

Менавіта кібаргам добраахвотна становіцца вынаходнік Мурашка ў п'есе Міколы Матукоўскага «Зомбі, альбо Мудрамер – два» (1998) – сіквела нашумелага ў канца 1980-х гг. «Мудрамера». Сам аўтар у прадмове падкрэслівае, што гэты твор наватарскі, бо ў ім зроблена спроба прасачыць за лёсам герояў, паглядзець, што з імі можа здарыцца за дзесяць гадоў. Мікалай Іванавіч Мурашка ўшывае сабе ў галаву сваё чарговае вынаходніцтва – прыбор, з дапамогай якога можна кіраваць воляй людзей, – і тым самым праяўляе сваю «інакшасць» у адносінах да грамадства. Але яго найлепшыя памкненні аказаліся безвыніковымі: маргіналы пачынаюць бясчынствы, спадзяванні Мурашкі на іх перавыхаванне заканчваюцца крахам. У п'есе падкрэсліваецца немагчымасць рэалізацыі добрых намераў ва ўмовах духоўнага крызісу, калі жаданні людзей зводзяцца да жывёльных інстынктаў. Дэдэманізацыя кібарга служыць для ўзмацнення гэтай ўстаноўкі.

У беларускім драматургічным мастацтве асобае месца займаюць гібрыдныя монстры. Напрыклад, Шэва ў аднайменнай п'есе Юрыя Станкевіча – гэта «нябачная, неарганічная, полевая сутнасць, магчыма, эфірная форма жыцця ці разумнай энергетычнай субстанцыі плазменнага тгыпу» [15, с. 8]. З аднаго боку, яна мае характар хімеры, а з другога – кібарга, бо мае зносіны з людзьмі праз адключанае радыё. Шэва ўвасабляе сабой экстэрыярызацыю страхаў Інгі, рэпарцёра Ліса, уфолага Сманцара, Ілжэмаёра, суседзяў Інгі. Кожнаму з іх яна расплюшчвае вочы на ўнутраную недасканаласць і слабасць. Гэта непераможаны монстр, бо «легіён імя мне, таму што нас шмат» [15, с. 27]. Відавочная алюзія на біблейскі тэкст падкрэслівае, што ў сучасным мастацтве роля нячыстай сілы, якая падмяняе чалавека, усё

больш узмацняецца. Часцей дэманалагічныя істоты выступаюць як крыніца падвойнай пагрозы: падзейная (знешняя матывацыя) і ўнутраная разбуральная сіла, якая ўкараняецца ў чалавеку як саматычная або псіхічная хвароба. Гэта, урэшце, знішчае асобу, якая ператвараецца ў маргінальную сутнасць. У мастацкім свеце твора Ю. Станкевіча яна мае дваістую прыроду, выконваючы кампенсаторную функцыю. Шэва абуджае ў асобе такія эмоцыі, як віна, сорам, агрэсія, зайздрасць, страх, раздражненне, незадаволенасць, адчай; яна дапамагае Інзе ўсвядоміць сваю недасканаласць, прымушае перманентна рэфлексаваць з нагоды свайго граху, не забываць пра сваё злачынства. У пэўнай ступені гэта адносіцца да іншых персанажаў п'есы. Адсюль вынікае, што Шэва – зусім не нешта негатыўнае, асацыяльнае; яна выступае ў апазіцыі да горшых праяў асобы і служыць крыніцай далейшага яе развіцця.

**Заключэнне**

У канцы XX ст. монстры становяцца неад'емнай часткай вобразнай сістэмы беларускай драматургіі. Найбольш прадуктыўнымі спосабамі іх стварэння з'яўляюцца хімерызацыя і гарганізацыя. Пры канструяванні зааморфных і натуральных монстраў часцей выкарыстоўваецца механізм хімерызацыі, а пры канструяванні антрападобных – гарганізацыя. Маюцца асобныя выпадкі стварэння кібаргаў і гібрыдных (з пункту гледжання механізму канструявання) монстраў.

Праз увядзенне монстрападобных істот у мастацкія тэксты аўтары пашыраюць вобразную сістэму і ўскладняюць антрапалагічную мадэль свету. Монстры нярэдка зліваюцца з чалавекам і становяцца яго ценем, што дазваляе больш аб'ёмна выявіць розныя псіхалагічныя тыпы асобы.

Вобразы монстраў у канкрэтных творах набываюць рознае семантычнае гучанне, але іх аб'ядноўвае ўсведамленне ўласнай «інакшасці» і амбівалентнасці. У рэцэпцыйнай жа свядомасці монстры атаясамліваюцца з псіхалагічнымі праблемамі грамадскай свядомасці, паколькі з'яўляюцца прадуктам несвядомай праекцыі палітыкі мультыкультуралізму ў сучасным соцыуме.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Žižek, S. Enjoy Your Symptom! Jacques Lacan in Hollywood and Out / S. Žižek. – New York ; London : Routledge, 2001. – 305 p.

2. Чужой и культурная безопасность / А. П. Романова [и др.]. – М. : РОССПЭН, 2013. – 215 с.

3. Суковатая, В. А. Лицо Другого: телесные образы Другого в культурной антропологии / В. А. Суковатая. – Харьков : ХНУ, 2009. – 518 с.

4. Шапинская, Е. Н. Образ Другого в текстах культуры / Е. Н. Шапинская. – М. : КРАСАНД, 2012. – 216 с.

5. Караткевіч, В. І. Сістэма ўмоўных вобразаў у драматургіі Ігара Сідарука (на матэрыяле выбраных твораў) / В. І. Караткевіч // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 19 крас. 2018 г. / пад рэд. С. Э. Сомава. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2018. – С. 55–58.

6. Караткевіч, В. І. Тэарэтычныя і гістарычныя аспекты постмадэрнізму ў беларускай літаратуры другой паловы 80 – 90-х гг. XX ст. : матэрыялы да спецкурса / В. І. Караткевіч. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 22 с.

7. Караткевіч, В. І. Цень як элемент вобразнай сістэмы драматургічных твораў Юрыя Станкевіча (на прыкладзе драмы «Шэва») / В. І. Караткевіч // Компаративні дослідження слов'янських мов і літератур : зб. наук. пр. – Київ : Освіта України, 2016. – Вип. 31. – С. 241–244.

8. Лаўшук, С. С. Гарызонты беларускай драматургіі / С. С. Лаўшук. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 412 с.

9. Макарэвіч, А. М. П'еса «Юдзіф» С. Кавалёва: драматургічная версія аднайменнай кнігі Старога запавету / А. М. Макарэвіч // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 20–21 крас. 2017 г. / пад рэд. В. М. Шаршнёвай. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. – С. 37–43.

10. Макарэвіч, А. М. Тыпы драматургічных вобразаў у п'есе «Машэка» Міколы Арахоўскага / А. М. Макарэвіч // Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства :

матэрыялы Міжнар. навук. канф. да 120-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы, Мінск, 3–4 сак. 2016 г. / рэдкал.: А. А. Манкевіч [і інш.] ; Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і літаратуры Нац. акад. навук Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2016. – С. 305–308.

11. Арахоўскі, М. Лабірынт / М. Арахоўскі // Крыніца. – 1997. – № 4. – С. 31–59.

12. Сідарук, І. Крык / І. Сідарук // Крыніца. – 1995. – № 4. – С. 39–49.

13. Овидий, П. Метаморфозы [Электронный ресурс] / П. Овидий – Режим доступа: http://www.wysotsky.com/0009/225.htm#04. – Дата доступа: 20.12.2020.

14. Арахоўскі, М. Ку-ку / М. Арахоўскі // Сучасная беларуская п'еса / склад. П. Васючэнка. – Мінск : Маст. літ., 1997. – С. 248–285.

15. Станкевіч, Ю. Армагедон – 1895 : п'есы, кінасцэнарый / Ю. Станкевіч. – Мінск : Дом прэсы, 2000. – 127 с.

REFERENCES

1. Žižek, S. Enjoy Your Symptom! Jacques Lacan in Hollywood and Out / S. Žižek. – New York ; London : Routledge, 2001. – 305 p.

2. Chuzhoj i kul'turnaja biezopasnost' / A. P. Roanova [i дdr.]. – M. : ROSSPEN, 2013. – 215 s.

3. Sukovataja, V. A. Kico Drugogo: tieliesnyje obrazy Drugogo v kul'turnoj antropologii / V. A. Sukovataja. – Khar'kov : KhNU, 2009. – 518 s.

4. Shapinskaja, Ye. N. Obraz Drugogo v tiekstakh kul'tury / Ye. N. Shapinskaja. – M. : KRASAND, 2012. – 216 s.

5. Karatkievich, V. I. Sistema umounykh vobrazau u dramaturhii Ihara Sidaruka (na мateryjalie vybranykh tvorau) / V. I. Karatkievich // Kuliashouskija chytanni : materyjaly Mizhnar. navuk.-prakt. kanf., Mahiliou, 19 kras. 2018 h. / pad red. S. E. Somava. – Mahiliou : MDU imia A. A. Kuliashova, 2018. – S. 55–58.

6. Karatkievich, V. I. Tearetychnyja i histarychnyja aspiekty postmadernu u bielaruskaj litaratury druhoj palovy 80 – 90-kh hh. XX st. : materyjaly da spieckursa / V. I. Karatkievich. – Mahiliou : MDU imia A. A. Kuliashova, 2003. – 22 s.

7. Karatkievich, V. I. Cien' jak eliemient vobraznaj sistemy dramaturhichnykh tvorau Yuryja Stankievicha (na prykladzi dramy «Sheva») / V. I. Karatkievich // Komparatyvni doslidzennia slovjans'kykh mov i literatur : zb. nauk. pr. – Kyjiv : Osvita Ukrajiny, 2016. – Vyp. 31. – S. 241–244.

8. Laushuk, S. S. Haryzonty bielaruskaj dramaturhii / S. S. Laushuk. – Minsk : Bielarus. navuka, 2010. – 412 s.

9. Makarevich, A. M. Pjesa «Yudzif» S. Kavaliova: dramaturhichnaja viersija adnajmiennaj knihi Staroha zapavietu / A. M. Makarevich // Kuliashouskija chytanni : materyjly Mizhnar. navuk.-prakt. kanf., Mahiliou, 20–21 kras. 2017 h. / pad red. V. M. Sharshniovaj. – Mahiliou : MDU imia A. A. Kuliashova, 2017. – S. 37–43.

10. Makarevich, A. M. Typy dramaturhichnykh vobrazau u pjesie «Masheka» Mikoly Arakhouskaha / A. M. Makarevich // Bielaruskaja litaratura u kul'turnaj prastory suchasnaha hramadstva : materyjaly Mizhnar. navuk. kanf. da 120-hoddzia z dnia naradzhennia Kandrata Krapivy, Minsk, 3–4 sak. 2016 h. / redkal.: A. A. Mankievich [i insh.] ; Centr dasliedvanniau bielarus. kul'tury, movy i litaratury Nac. akad. navuk Bielarusi. – Minsk : Prava i ekanomika, 2016. – S. 305–308.

11. Arakhouski, M. Labirynt / M. Arakhouski // Krynica. – 1997. – № 4. – S. 31–59.

12. Sidaruk, I. Kryk / I. Sidaruk // Krynica. – 1995. – № 4. – S. 39–49.

13. Ovidij, P. Mietamorfozy [Eliektronnyj riesurs] / P. Ovidij. – Riezhim dostupa: http://www.wysotsky.com/0009/225.htm#04. – Data dostupa: 20.12.2020.

14. Arakhouski, M. Ku-ku / M. Arakhouski // Suchasnaja bielaruskaja pjesa / sklad. P. Vasiuchenka. – Minsk : Mast. lit., 1997. – S. 248–285.

15. Stankievich, Yu. Armahiedon – 1895 : pjesy, kinascenaryj / Yu. Stankievich. – Minsk : Dom presy, 2000. – 127 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 21.05.2021*